УДК 371.035.6
ББК 74.200.51я71
Г756

Печатается по решению редакционно-издательского совета БГПУ

***Редакционная коллегия:*** доктора педагогических наук, профессора В. В. Буткевич, Н. И. Мицкевич; кандидаты педагогических наук, доценты Л. И. Баранова, А. В. Верниковская, Н. В. Савченко; кандидат филологических наук, доцент С. К. Бердник

Г756 **Гражданское** воспитание младших школьников: психолого-педагогические и методические аспекты: Материалы Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 3–4 нояб. 2003 г.– Мн.: БГПУ, 2004.– 174 с.
ISBN 985-435-833-Х

В материалах сборника раскрываются историко-педагогические, теоретико-методологические, научно-методические основы гражданского образования. Рассматриваются пути и средства формирования у подрастающего поколения гражданских качеств.

Адресован преподавателям и студентам высших и средних педагогических учебных заведений, учителям школ, воспитателям дошкольных учреждений.

**УДК 371.035.6**
**ББК74.200.51я71**

ISBN 985-435-833-Х
© Коллектив авторов, 2004
© УИЦ БГПУ, 2004

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## СТАНАЎЛЕННЕ ДЗІЦЯЧЫХ І ЮНАЦКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ У БССР ( 20-я гады XX ст.)

***І. І. Забаўская (г. Мінск)***

Стварэнне першых дзіцячых суполак праходзіла ў БССР у складаных палітычных і эканамічных умовах. Яшчэ не загаіліся раны, нанесеныя насельніцтву ў гады І сусветнай і грамадзянскай войнаў, і паўсталі новыя цяжкасці, якія былі іх непасрэдным вынікам: разбурэнні, голад і холад. Асабліва складана даводзілася дзецям, бацькі якіх загінулі на франтах ці сталі ахвярамі новых палітычных рэжымаў. Задача выхавання падрастаючага пакалення легла на плечы дзяржавы, у тым ліку і камсамола. Па выніках рашэнняў III з'езда камсамола Беларусі ужо ў 1921 годзе ў Мінску была створана першая дзіцячая група, якая атрымала назву «Дзіцячая камуна". Аналагічныя арганізацыі хутка ўзніклі і ў іншых гарадах рэспублікі. Разам з дзіцячымі клубамі пры мясцовых бібліятэках (якія былі галоўнымі цэнтрамі культуры, асабліва на весцы) яны і сталі асновай для пачатку піянерскага руху. Яго дзейнасць накіроўвалі органы самакіравання ў дзіцячых дамах-камунах.

З 1922 года піянерская арганізацыя набывае афіцыйны статус, быў надрукаваны яе статут і праграма дзейнасці. Першую піянерскую арганізацыю Беларусі ўзначаліў камсамолец А. І. Якімовіч.

Дакладны накірунак дзейнасці юных спартакаўцаў (так была названа першая піянерская арганізацыя Беларусі) быў вызначаны на V з'ездзе (кастрычнік 1992 г.) РКСМ і прыняты затым камсамолам Беларусі. Галоўным напрамкам лічылася працоўнае і ідэалагічнае выхаванне. Для гэтых мэт у краіне па магчымасці ствараліся пэўныя ўмовы: працоўныя камуны, майстэрні, сельскагаспадарчыя калоніі і дзіцячыя дамы. Але найбольш складанай праблемай у выхаваўчай рабоце была ліквідацыя беспрытульнасці, паколькі для яе вырашэння патрэбны былі вялікія сродкі і кваліфікаваныя кадры педагогаў. Піянерскія арганізацыі актыўна ўключыліся ў арганізацыйную работу (збіралі сродкі для беспрытульных, ставілі платныя спектаклі).

Восень 1923 г. можна лічыць пераломным момантам у справе ўдасканалення дзейнасці піянерыі з моладдзю. Было зацверджана новае "Арганізацыйнае палажэнне", паводле якога дзіцячая арганізацыя "Беларуская дружына юных спартакаўцаў імя К. Лібкнехта" атрымала назву "Беларуская дзіцячая камуністычная арганізацыя юных спартакаўцаў імя К. Лібкнехта". Кіраўніцтва было ўскладзена на Цэнтральнае бюро дзіцячых груп пры ЦК КСМБ. [3, 177-178. ]. Камсамол накіраваў дзейнасць піянерскіх арганізацый на выхаванне патрыятызму і інтэрнацыяналізму, падрыхтоўку дастойнай змены камсамолу. Дзейнасць наладжвалася па ўсіх накірунках: арганізацыя самадзейных выступленняў перад працоўнымі, распаўсюджванне плакатаў, лістовак, якія сведчылі аб дасягненнях краіны, арганізацыя, падрыхтоўка і правядзенне ўрадавых святаў (1 Мая, Міжнародны дзіцячы тыдзень, Дзень ураджаю). У працоўным навучанні галоўная ўвага надавалася рабоце ў скверах, садах, збору гербарыяў.

Пасля смерці У. І. Леніна (21 студзеня 1924 г.) беларуская спартакаўская арганізацыя была перайменавана ва Усесаюзную піянерскую арганізацыю імя У. І. Леніна. У чэрвені 1924 г. VII з'езд камсамола Беларусі падкрэсліў важнасць адукацыйнай работы, асабліва летам, калі адкрываюцца вялікія магчымасці для вывучэння роднай прыроды; а таксама неабходнасць шырока праводзіць работу па выхаванню ў дзяцей "навыкаў самастойнага жыцця і арганізацыі калектыўнай працоўнай дзейнасці (лагеры, майстэрні)". [3, 180. ]. Для папулярызацыі маладзежных арганізацый, інфармавання рэгіянальных аддзяленняў, больш грунтоўнай цэнтралізаванай дзейнасці піянерыі і камсамола з снежня 1924 г. пачаў выходзіць часопіс "Беларускі піянер". Грамадска-палітычнае выхаванне дзяцей ажыццяўлялася пад лозунгам "Ад барабаннага бою – да паглыбленай работы" (VI з'езд РКСМ).



Выходзячы з патрабаванняў часу, узмацнялася ідэалагічная праца ў школах, дзе ствараліся «фарпосты» з мэтай прыцягнення школьнікаў да палітычнага жыцця. Сутнасць «фарпостаў» у школах заключалася ў правядзенні ранішнікаў, арганізацыі чытальні, гурткоў, выпуску сценгазет, аказанню дапамогі адстаючым, прыцягненню школьнікаў да ўдзелу ў палітычных ранішніках.

Шмат праблем было ў арганізацыі дзіцячага руху на вёсцы. Шэфы з гарадоў у выхадныя дні дапамагалі сельскім піянерам. Яны фарміравалі бібліятэкі, праводзілі гутаркі на палітычныя тэмы, арганізоўвалі піянерскія гульні.

XIII з'езд РКП(б) прызнаў неабходным асігнаваць на палітасвету ў весцы дадатковыя сродкі, пашырыць сетку хатаў-чытальняў. У выніку іх колькасць у Беларусі з 1922 па 1925 гг. узрасла з 117 да 271. [1, 314-315]. Шмат увагі надавалася распаўсюджванню друку ў сельскай мясцовасці. У 1925 г. выдавалася 20 газет і 15 часопісаў агульным тыражом 130 тыс. экзэмпляраў. [2, 12].

У 1930 годзе падводзіўся вынік дзейнасці беларускай піянерскай арганізацыі. У першую чаргу гэта было неабходна для ажыццяўлення ўсеагульнай пачатковай адукацыі. Піянеры дапамагалі правесці перапіс дзяцей, якія павінны былі наведваць школу.

Такім чынам, з самага пачатку існавання беларуская піянерская арганізацыя дзейнічала з дапамогай і пад непасрэдным кіраўніцтвам камсамола. Пільны кантроль ажыццяўляўся з боку партыйных органаў, што, безумоўна, абмяжоўвала магчымасці поўна выявіць самадзейныя накірункі палітычнай работы.

***Літаратура:***


1. Гісторыя Беларускай ССР. Т. 3; Мн. 1973, с. 314-315.
2. "Красная печать", 1924, № 32, с. 12.
3. Народная адукацыя і педагагічная навука ў Беларусі (1917-1945), Мн., 1993, с. 177-178, 180.


## ПОИСКОВАЯ И КРАЕВЕДЧЕСКАЯ РАБОТА КАК СРЕДСТВО ВОСПИТАНИЯ НАЦИОНАЛЬНОГО САМОСОЗНАНИЯ И ГРАЖДАНСТВЕННОСТИ СТУДЕНТОВ

***В. С. Заброцкая (г. Мозырь)***

*При подготовке студентов в профессиональной деятельности важное значение имеют занятия по ознакомлению с национальной белорусской культурой, народными традициями, способствующие формированию у будущих педагогов национального самосознания, художественной культуры, гражданственности.*

В процессе поисковой и краеведческой работы студентов факультета педагогики и методики начального обучения Мозырского государственного педагогического университета решаются следующие задачи:

1. Пополнение, систематизация и обобщение знаний о творчестве полесских народных мастеров декоративно-прикладного искусства.
2. Формирование взглядов и представлений о национальной символике, традициях, фольклоре белорусского народа.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ